# ДАПАМАГАЦЬ МАЛАДЫМ РАБОТНІКАМ

## МЕСЕНЖЫК—бібліятэка імя Леніна

Доўгі час бібліятэка фабрыкі імя Кагановіча была без нагляду. Бібліятэкай загадвала працаўніца, якая не магла паставіць работу на належную вышыню. Пра такое становішча ведалі добра ў фабкоме і парткоме, але ўсё марудзілі з дачай добрага працаўніка. Бібліятэка яшчэ дагэтуль не аздаравіла сваю работу.

Як-жа абстаіць справа з работай масавых бібліятэк? Сапраўднай дапамогі масавым бібліятэкам мы ўсё яшчэ не аказваем. Метадычны сектар Цэнтральнай бібліятэкі імя Леніна мала ўдзяляе ўвагі масавым бібліятэкам. Напрыклад, калі было пастаўлена пытанне перад гарана аб дзіцячых бібліятэках школ і мы асабіста хацелі гутарыць па гэтаму пытанню з Захарэвічам, апошняя палічыла залішне займацца гутаркай, і нас нават не пусціла да сябе. Пытанне аб дзіцячых бібліятэках так і асталося нявырашаным.

Варта спыніцца на пытанні аб паліт-асветных школах.

Была арганізавана школа. Набралі людзей. Але ёю ніхто не цікавіўся, і праз кароткі час школа развалілася. Слухачы не пайшлі працаваць кандуктарамі, бо на іх зусім забылася бібліятэчнае кіраўніцтва.